# БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАСТОРА.
# ВІЦЕБСКІ РЭГІЁН

*Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь*

БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАСТОРА.
ВІЦЕБСКІ РЭГІЁН

*Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь*

Складальнік **Нявейкава** Вольга Макараўна

Адказны за выпуск А. І. Сёмкін

Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Мастацкае афармленне

Тыраж 10 экз.

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601 г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: vlib@vlib.by

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”

Аддзел бібліятэказнаўства

# БІБЛІЯТЭЧНАЯ ПРАСТОРА. ВІЦЕБСКІ РЭГІЁН

***Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь***

Віцебск

2014

УДК 027
ББК 78.34(4Беи-4Вит)
Б67

Складальнік *В. М. Нявейкава*

Рэдакцыйная калегія:

*Т. М. Адамян (адказ. рэд.), А. М. Васілеўская, М. В. Анегдзіна*

Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

На вокладцы:

**Бібліятэчная прастора. Віцебскі рэгіён** : інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. В. М. Нявейкава]. — Віцебск, 2014. — 32 с.

У штогадовым выданні прадстаўлены агляды дзейнасці Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна і публічных бібліятэк сістэмы Міністэртсва культуры ў Віцебскай вобласці за 2013 год.

Выданне прызначана для бібліятэчных работнікаў, спецыялістаў у галіне інфармацыйных тэхналогій, кіраўнікоў органаў кіравання культурай, а таксама для тых, хто цікавіцца развіццём бібліятэчнай справы ў вобласці.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2014

## АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ БІБЛІЯТЭК ВОБЛАСЦІ

| ЦБС | Колькасць камп'ютарызаваных бібліятэк | Колькасць камп'ютараў 2012 год | Колькасць | Доступ да сеткі інтэрнэт | Сайт | Электронны адрас | Колькасць АРМаў для карыстальнікаў | Колькасць бібліятэк, якія маюць модуль АБІС "Абслугоўванне чытачоў" |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аршанская | 19 | 75 | 82 | 10 | 0 | 10 | 25 | 6 |
| Бешанковіцкая | 11 | 17 | 21 | 7 | 0 | 2 | 21 | 1 |
| Браслаўская | 23 | 32 | 34 | 10 | 0 | 10 | 23 | 3 |
| Верхнядзвінская | 13 | 20 | 19 | 7 | 0 | 6 | 0 | 1 |
| Віцебская | 21 | 30 | 31 | 19 | 0 | 19 | 22 | 1 |
| Гарадоцкая | 12 | 23 | 23 | 11 | 1 | 10 | 17 | 1 |
| Глыбоцкая | 16 | 33 | 34 | 14 | 0 | 13 | 6 | 1 |
| Докшыцкая | 13 | 18 | 16 | 9 | 1 | 9 | 13 | 1 |
| Дубровенская | 15 | 27 | 29 | 14 | 0 | 14 | 15 | 1 |
| Лепельская | 14 | 27 | 28 | 14 | 1 | 14 | 15 | 1 |
| Лёзненская | 15 | 19 | 22 | 12 | 1 | 12 | 16 | 1 |
| Міёрская | 12 | 20 | 20 | 10 | 1 | 10 | 12 | 1 |
| Пастаўская | 13 | 23 | 23 | 12 | 1 | 11 | 2 | 1 |
| Полацкая | 35 | 70 | 84 | 25 | 1 | 25 | 15 | 2 |
| Расонская | 11 | 17 | 17 | 8 | 0 | 1 | 11 | 1 |
| Сенненская | 13 | 18 | 20 | 9 | 1 | 8 | 12 | 1 |
| Талачынская | 13 | 16 | 18 | 4 | 0 | 4 | 0 | 0 |
| Ушацкая | 10 | 20 | 17 | 7 | 0 | 7 | 1 | 1 |
| Чашніцкая | 23 | 32 | 41 | 14 | 1 | 14 | 14 | 2 |
| Шаркаўшчынская | 10 | 18 | 18 | 9 | 0 | 9 | 11 | 1 |
| Шумілінская | 12 | 22 | 23 | 8 | 1 | 8 | 14 | 1 |
| **Усяго по РЦБС** | **324** | **577** | **620** | **233** | **10** | **216** | **265** | **29** |
| г. Віцебск | 12 | 109 | 109 | 3 | 1 | 3 | 27 | 1 |
| г. Наваполацк | 7 | 51 | 51 | 7 | 1 | 7 | 6 | 3 |
| **Усяго по ГЦБС** | 19 | 160 | 160 | 10 | 2 | 10 | 33 | 4 |
| **Усяго па ЦБС** | **343** | **737** | **780** | **243** | **12** | **226** | **298** | **33** |
| Абласная бібліятэка | 1 | 116 | 128 | 1 | 1 | 1 | 27 | 1 |
| **Усяго па вобласці** | **344** | **853** | **908** | **244** | **13** | **227** | **325** | **34** |

## СТАН БІБЛІЯТЭЧНЫХ ФОНДАЎ

| ЦБС | Бібл.фонд на 01.01.2013 | Бібл.фонд на 01.01.2014 | Паступіла усяго (экз.) | Паступіла сац. значчай (экз.) | Паступіла сац. значчай на сумму (млн.) | Выбыла усяго (экз.) | Працэнт абнаўлення фонда | Працэнт выканання нарматыва фінансавання камплектавання |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аршанская | 766038 | 739203 | 31771 | 2323 | 47,8 | 41736 | 4,3 | 15,6 |
| Бешанковіцкая | 236500 | 232067 | 13129 | 515 | 16,0 | 17562 | 5,7 | 16,0 |
| Браслаўская | 289981 | 288685 | 14325 | 2549 | 72,8 | 15621 | 5,0 | 15,7 |
| Верхнядзвінская | 275898 | 270157 | 14903 | 1337 | 53,2 | 20644 | 5,5 | 17,1 |
| Віцебская | 422736 | 422589 | 15038 | 855 | 34,1 | 15185 | 3,6 | 15,2 |
| Гарадоцкая | 317593 | 283632 | 16167 | 403 | 15,0 | 50128 | 5,7 | 13,6 |
| Глыбоцкая | 366955 | 372910 | 21747 | 960 | 24,9 | 15792 | 5,8 | 15,9 |
| Докшыцкая | 312436 | 281390 | 20957 | 631 | 28,7 | 52003 | 7,4 | 16,4 |
| Дубровенская | 277386 | 277790 | 14325 | 599 | 27,3 | 13921 | 5,2 | 15,8 |
| Лепельская | 223802 | 225038 | 19478 | 570 | 28,3 | 18242 | 8,7 | 16,6 |
| Лёзненская | 198795 | 198106 | 12574 | 212 | 8,0 | 13263 | 6,3 | 16,8 |
| Міёрская | 273698 | 270521 | 15665 | 637 | 34,5 | 18842 | 5,8 | 17,9 |
| Полацкая | 680119 | 583947 | 32482 | 934 | 39,1 | 29206 | 5,6 | 15,9 |
| Пастаўская | 292684 | 282763 | 12366 | 575 | 26,6 | 22287 | 4,4 | 16,4 |
| Расонская | 173686 | 168226 | 7593 | 241 | 15,4 | 13053 | 4,5 | 15,9 |
| Сенненская | 307213 | 289329 | 13804 | 696 | 28,5 | 31688 | 4,8 | 16,3 |
| Талачынская | 247867 | 249514 | 11265 | 609 | 21,3 | 9618 | 4,5 | 14,7 |
| Ушацкая | 214480 | 202810 | 8835 | 384 | 17,9 | 20505 | 4,4 | 16,5 |
| Чашніцкая | 347637 | 350175 | 23395 | 1085 | 28,9 | 20857 | 6,7 | 16,3 |
| Шаркаўшчынская | 210457 | 201663 | 9683 | 285 | 14,7 | 18477 | 4,8 | 15,7 |
| Шумілінская | 195197 | 181608 | 12112 | 184 | 12,2 | 25701 | 6,7 | 15,6 |
| **Усяго па РЦБС** | **6631158** | **6372123** | **341614** | **16584** | **595,2** | **484331** | **5,4** | **16,0** |
| г. Віцебск | 870431 | 871118 | 36248 | 852 | 48,0 | 35561 | 4,2 | 12,4 |
| г. Наваполацк | 339943 | 453091 | 18157 | 1758 | 80,0 | 21327 | 4,0 | 15,2 |
| **Усяго па ГЦБС** | **1210374** | **1324209** | **54405** | **2610** | **128,0** | **56888** | **4,1** | **13,3** |
| **Усяго па ЦБС** | **7841532** | **7696332** | **396019** | **19194** | **723,2** | **541219** | **5,1** | **15,5** |
| Абласная бібліятэка | 714525 | 716680 | 15862 | 110 | 8,6 | 13707 | 2,2 | 15,0 |
| **Усяго па вобласці** | **8556057** | **8413012** | **411881** | **19304** | **731,8** | **554926** | **4,9** | **15,5** |



# ЗМЕСТ

**ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ**

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА Ў 2013 ГОДЗЕ
*Адамян Т.М. – намеснік дырэктара Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна*……………….…………………….………4

ПУБЛІЧНЫЯ БІБЛІЯТЭКІ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ: ПАД ЗНАКАМ АПТЫМІЗАЦЫІ
*Нявейкава В.М. – загадчык аддзела бібліятэказнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна*……….………..…21

**Дадаткі**…………………………………………………….…………………29

## *ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І. ЛЕНІНА Ў 2013 ГОДЗЕ*

У 2013 годзе аддзеламі абслугоўвання бібліятэкі абслужана 51225 карыстальнікаў, ім было выдана за справаздачны год 1017304 экз. бібліятэчных дакументаў. Наведванні па бібліятэцы склалі 241907. У справаздачным годзе колькасць віртуальных наведванняў афіцыйнага сайта бібліятэкі склала 178192.

У 2013 годзе на камплектаванне бібліятэчнага фонду зрасходавана 1419,6 млн. рублёў бюджэтных сродкаў. У тым ліку: на кнігі – 933,2 млн. руб.; на перыядычныя выданні – 486,6 млн. руб. Усяго ў фонд бібліятэкі было набыта 15862 экз. дакументаў. У тым ліку за бюджэтныя сродкі – 15704 экз. дакументаў, за пазабюджэтныя – 158 экз. кніг. Пазабюджэтныя выдаткі на набыццё літаратуры склалі 12,8 млн. рублёў. Паказчык ад агульнага бюджэту на камплектаванне склаў 15 % (у 2012 годзе – 19,6 %). У 2013 годзе ў фонд паступіла 8242 экз. кніг, што на 2456 экз. больш, чым у 2012 годзе.

Сацыяльна значных выданняў у 2013 годзе набыта 110 экз. на суму 8,6 млн. рублёў, агучаных дакументаў – 73 экз. на суму 4,5 млн. рублёў, электронных выданняў – 137 экз. на суму 6,4 млн. рублёў. Кніг беларускіх выдавецтваў, у тым ліку на беларускай мове, набыта 4344 экз. Непасрэдна ў беларускіх выдавецтваў набыта 1313 экз. дакументаў (14,3 % ад агульнай колькасці). У справаздачным годзе большасць выданняў набыта праз кнігагандлёвыя фірмы. Адной з істотных крыніц папаўнення фонду бібліятэкі заставаліся дары – аўтараў, арганізацый і ўстаноў, прыватных асоб. У 2013 годзе ў дар атрымана 975 экз. кніг, што складае 10,6 % ад агульнай колькасці паступіўшых у бібліятэку дакументаў.

На пачатак 2014 года камп'ютарны парк бібліятэкі склаў 128 адзінак, 111 з іх аб'яднаны ў лакальную сетку. У мінулым годзе было набыта 13 камп'ютараў, 3 прынтары, 2 МФУ, 1 ноўтбук. У аддзеле



# Дадаткі

### СЕТКА БІБЛІЯТЭК. АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

| ЦБС | Сетка 2012 | Сетка 2013 | Колькасць чытачоў | Выдача | Фонд | Наведванні | Чытальнасць | Абарачальнасць | Наведвальнасць | Усяго бібл. работ. | З бібл. адукацыяй |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аршанская | 47 | 45 | 53 269 | 1 066 151 | 739 203 | 363 733 | 20,01 | 1,44 | 6,83 | 106 | 76 |
| Бешанковіцкая | 22 | 21 | 11 462 | 228 954 | 232 067 | 91 781 | 19,98 | 0,99 | 8,01 | 39 | 22 |
| Браслаўская | 35 | 35 | 18 242 | 377 216 | 288 685 | 158 149 | 20,68 | 1,31 | 8,67 | 57 | 31 |
| Верхнядзвінская | 22 | 22 | 12 777 | 239 772 | 270 157 | 85 347 | 18,77 | 0,89 | 6,68 | 44 | 26 |
| Віцебская | 40 | 36 | 25 297 | 513 703 | 422 589 | 190 001 | 20,31 | 1,22 | 7,51 | 60 | 33 |
| Гарадоцкая | 31 | 31 | 15 125 | 305 062 | 283 632 | 125 429 | 20,17 | 1,08 | 8,29 | 58 | 40 |
| Глыбоцкая | 34 | 34 | 23 184 | 435 893 | 372 910 | 160 451 | 18,80 | 1,17 | 6,92 | 60 | 45 |
| Докшыцкая | 33 | 28 | 15 810 | 302 653 | 281 390 | 130 281 | 19,14 | 1,08 | 8,24 | 49 | 35 |
| Дубровенская | 22 | 22 | 11 418 | 224 700 | 277 790 | 85 066 | 19,68 | 0,81 | 7,45 | 38 | 30 |
| Лепельская | 24 | 23 | 17 731 | 395 391 | 225 038 | 124 716 | 22,30 | 1,76 | 7,03 | 45 | 32 |
| Лёзненская | 22 | 21 | 12 518 | 247 179 | 198 106 | 108 092 | 19,75 | 1,25 | 8,63 | 37 | 26 |
| Міёрская | 31 | 31 | 12 672 | 238 190 | 270 521 | 96 949 | 18,80 | 0,88 | 7,65 | 48 | 31 |
| Пастаўская | 30 | 30 | 18 362 | 350 099 | 282 763 | 151 747 | 19,07 | 1,24 | 8,26 | 50 | 37 |
| Полацкая | 43 | 42 | 46 609 | 845 118 | 583 947 | 321 008 | 18,13 | 1,45 | 6,89 | 110 | 75 |
| Расонская | 15 | 14 | 6 793 | 144 495 | 168 226 | 50 481 | 21,27 | 0,86 | 7,43 | 23 | 13 |
| Сенненская | 28 | 24 | 16 601 | 332 743 | 289 329 | 126 578 | 20,04 | 1,15 | 7,62 | 44 | 28 |
| Талачынская | 23 | 23 | 13 559 | 248 756 | 249 514 | 89 472 | 18,35 | 1,00 | 6,60 | 42 | 28 |
| Ушацкая | 21 | 21 | 10 424 | 194 516 | 202 810 | 69 330 | 18,66 | 0,96 | 6,65 | 33 | 21 |
| Чашніцкая | 24 | 24 | 24 614 | 511 591 | 350 175 | 176 058 | 20,78 | 1,46 | 7,15 | 56 | 51 |
| Шаркаўшчынская | 22 | 21 | 10 649 | 200 677 | 201 663 | 77 605 | 18,84 | 1,00 | 7,29 | 37 | 26 |
| Шумілінская | 24 | 23 | 14 802 | 312 822 | 181 608 | 129 899 | 21,13 | 1,72 | 8,78 | 46 | 24 |
| **Усяго па РЦБС** | **593** | **571** | **391 918** | **7 715 681** | **6 372 123** | **2 912 173** | **19,69** | **1,21** | **7,43** | **1082** | **730** |
| г. Віцебск | 21 | 21 | 96 706 | 1 745 250 | 871 118 | 694 951 | 18,05 | 2,00 | 7,19 | 161 | 128 |
| г. Наваполацк | 7 | 7 | 31 373 | 635 246 | 453 091 | 225 138 | 20,25 | 1,40 | 7,18 | 65 | 56 |
| **Усяго па ГЦБС** | **28** | **28** | **128 079** | **2 380 496** | **1 324 209** | **920 089** | 18,59 | 1,80 | 7,18 | 226 | 184 |
| **Усяго па ЦБС** | **621** | **599** | **519 997** | **10 096 177** | **7 696 332** | **3 832 262** | **19,42** | **1,31** | **7,37** | **1308** | **914** |
| Абл. бібліятэка | 1 | 1 | 51 225 | 1 017 304 | 716 680 | 241 907 | 19,86 | 1,42 | 4,72 | 107 | 83 |
| **Усяго па вобласці** | **622** | **600** | **571 222** | **11 113 481** | **8 413 012** | **4 074 169** | **19,46** | **1,32** | **7,13** | **1415** | **997** |
| **Да 2012 года** | | **-22** | **-4 982** | **-55 114** | **-143 045** | **-3 964** | | | | **-54** | **-5** |

У Віцебскай вобласці кожная бібліятэчная сетка прапаноўвае ў сярэднім 32 віды такіх паслуг. За мінулы год публічнымі бібліятэкамі было выканана платных паслуг на суму 1613,1 млн. рублёў. Лідарства па гэтым паказчыку замацавалася за Аршанскай (190 млн.), Наваполацкай (158,1 млн.) і Полацкай (147,2 млн.) бібліятэчнымі сеткамі. У пераліку па заробленых сумах на адну бібліятэку з вялікім адрывам выйшла ў лепшыя тая ж Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк (22,6 млн.), гэта пры тым, што сярэдні паказчык па вобласці склаў амаль 2,7 млн. рублёў.

Традыцыйна ў спецвыпуску інфармацыйна-аналітычнага бюлетэня «Бібліятэчная прастора. Віцебскі рэгіён» складальнікі прадстаўлялі інфармацыю аб найбольш значных сацыякультурных мерапрыемствах, што прайшлі на працягу мінулага года ў публічных бібліятэках вобласці. На гэты раз было вырашана змяніць фармат агляда работы і адмовіцца ад аповеда пра масавую работу бібліятэк, тым больш што ўсё зацікаўленыя добра ведаюць, што звесткі пра найбольш значныя падзеі, што адбываюцца ва ўстановах культуры вобласці (і ў бібліятэках у тым ліку) Віцебская абласная бібліятэка прадстаўляе ў іншым выданні – інфармацыйным паведамленні «Культурнае жыццё Віцебскай вобласці», якое прапануецца зацікаўленаму чытачу досыць аператыўна – кожны месяц. Нагадаем, што паўнатэкставая версія азначанага выдання даступна праз афіцыйны сайт Віцебскай абласной бібліятэкі – http://vlib.by (раздзел «Издания», падраздзел «Информационно-методические издания»). Будзем спадзявацца, што на старонках гэтага выдання і ў бягучым годзе будзе шмат паведамленняў аб паспяховай дзейнасці публічных бібліятэк, і казаць пра аптымізацыю бібліятэчнай справы яго складальнікі будуць не ў пытальнай, а выключна сцвярджальнай інтанацыі.

*Нявейкава В. М. – загадчык аддзела бібліятэказнаўства*
*Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна*



перыядычнай літаратуры ўстаноўлена тыфлаабсталяванне, якое складаецца з камп'ютара, аснашчанага праграмай JAWS for Windows Screen Reading Software, апаратна-праграмнага комплексу «Чытаючая машына ElecGeste INFA-300» і электроннага ручнога відэапавелічальніка ЭРВП КРУСТ-02, што дазваляе чытачам са слабым зрокам і невідушчым атрымліваць доступ да інфармацыйных рэсурсаў. На працягу года аддзелам аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў ажыццяўлялася суправаджэнне комплексу праграм бібліятэчнай сістэмы ALIS-WEB, была праведзена значная работа па ўдасканальванні веб-сайта бібліятэкі.

У справаздачным годзе залу каталогаў наведала 11035 карыстальнікаў, дзяжурным бібліёграфам па запытах чытачоў было выканана 6112 даведак, аказана 5642 кансультацыі.

На працягу справаздачнага года ў аддзелах абслугоўвання арганізоўваліся выставы і цыклы выстаў да знамянальных падзей, свят беларускага календара: «Мілагучнае, звонкае, роднае слова!» (21 лютага – Міжнародны дзень роднай мовы); «Святая заступніца Беларусі» (5 чэрвеня – Дзень памяці Святой Еўфрасінні Полацкай); «Беларусь гераічная мая» (3 ліпеня – Дзень вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў); «Свята славянскай культуры» (Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»); «Праз цемру невуцтва…» (2 верасня – Дзень беларускага пісьменства) і інш.

Юбілейныя даты майстроў беларускага слова К. Буйло, У. Арлова, С. Грахоўскага, П. Галавача, Я. Маўра і інш. адзначаны персанальнымі выставамі на тэматычным стэлажы «Літаратурны каляндар». Да юбілею славутых пісьменнікаў, класікаў беларускай літаратуры М. Гарэцкага і Ю. Свіркі былі падрыхтаваны віртуальныя выставы. Для прыцягнення дзяцей да чытання кніг на роднай мове быў праведзены Дзень роднай мовы, у час якога былі падрыхтаваны выставы, гучныя чытанні прайшлі інтэлектуальныя гульні. У верасні да Дня беларускага пісьменства прайшла акцыя «Далучыся да роднага слова», у рамках якой дзеці ў гульнёвай форме знаёміліся з новымі, незвычайнымі і

цікавымі словамі на беларускай мове.

У справаздачным годзе пачалося супрацоўніцтва з філалагічным факультэтам УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава». Слухачам давузаўскай падрыхтоўкі ў сакавіку быў прадстаўлены агляд «Беларуская мова: цікава і складана», прапанаваны буклеты і рэкамендацыйныя спісы літаратуры па вывучэнні беларускай мовы для тых, хто паступае ў ВНУ.

24 кастрычніка ў «Віцебскай абласной бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з вядомым беларускім паэтам, публіцыстам, крытыкам, перакладчыкам, лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы Г.М. Бураўкіным.

Да 100-годдзя з дня нараджэння А.В. Багатырова падрыхтаваны і выдадзены біябібліяграфічны паказальнік «Жыццё эпохі: Анатоль Багатыроў». Юбілейнае выданне знаёміць з жыццём, дзейнасцю, публікацыямі і выданнямі музычнай спадчыны беларускага кампазітара. На сайт бібліятэкі падрыхтаваны электронны рэсурс «Патрыярх сучаснай музычнай культуры», які таксама прысвечаны знакамітаму кампазітару.

На працягу года ў аддзеле абанемента да ўвагі чытачоў быў прадстаўлены інфармацыйны стэлаж «Добры дзень, беларуская кніга». Для папулярызацыі новых паступленняў у фонд бібліятэкі, да знамянальных і памятных дат былі створаны шматлікія прэзентацыі для дэманстравання на плазмавай панэлі ў фае бібліятэкі.

За справаздачны год былі падрыхтаваны 5 бібліяграфічных выданяў краязнаўчай тэматыкі. Сярод іх – «Каляндар знамянальных і памятных дат Віцебшчыны на 2014 год», бягучы ўніверсальны паказальнік «Віцебская вобласць» за 2012 год (першы і другі кварталы) і за 2013 год (першы квартал), бібліяграфічнае выданне да юбілею дырэктара бібліятэкі «Бібліятэкар №1».

Да 70-годдзя з дня вызвалення Віцебскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў супрацоўнікамі пачата работа над поўнатэкставай БД «Дарогамі вызвалення Віцебшчыны». У 2013 годзе была прадоўжана



сервера, то ў 2012 – ужо тры, а ў 2013 – чатыры: для Лепельскай, Пастаўскай, Полацкай і Чашніцкай цэнтральных раённых бібліятэк.

На жаль, нездавальняючая сітуацыя складваецца ў бібліятэках вобласці па стварэнні ўласных афіцыйных сайтаў. Іх колькасць ні то што не павялічылася, а нават зменшылася (14 – у 2012 годзе, 12 – у 2013). І гэта не дзіўна: адкрыць сваё вэб-прадстаўніцтва – гэта толькі пачатак справы, далей павінна ісці пастаянная мэтанакіраваная работа па забеспячэнні яго жыццядзейнасці – напаўненні актуальнай, змястоўнай і цікавай інфармацыяй і, зразумела, тэхнічнае суправаджэнне. І менавіта гэтая частка работы аказваецца не пад сілу бібліятэчным работнікам. Таму раз-пораз і трапляеш у віртуальнай прасторы на бібліятэчныя сайты-прывіды, некалі створаныя і забытыя сваімі стваральнікамі.

У параўнанні з папярэднім годам колькасць бібліятэчных работнікаў у публічных бібліятэках скарацілася з 1355 да 1308 чалавек. Звяртае на сябе ўвагу тое, што бібліятэку пакідаюць у першую чаргу работнікі без спецыяльнай бібліятэчнай адукацыі: з 47 скарочаных работнікаў толькі чатыры былі дыпламаванымі бібліятэкарамі. Гэта яшчэ раз падкрэслівае значнасць спецыяльнай адукацыі, асабліва сёння – ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі, якая, як мяркуецца, з цягам часу ў бібліятэчным асяроддзі будзе толькі ўзрастаць.

Па гадавых справаздачах было выяўлена, што ў мінулым годзе капітальны рамонт у публічных бібліятэках вобласці не праводзіўся, але ж быў неабходны ў чатырох бібліятэчных будынках, у тым ліку ў двух цэнтральных – Наваполацкай і Ушацкай. З 599 публічных бібліятэк сеткі Міністэрства культуры ў Віцебскай вобласці 1 бібліятэка знаходзіцца ў аварыйным стане, 4 не ацапліваюцца і 164 нетэлефанізаваны. Хочацца спадзявацца, што гэтыя недахопы будуць ліквідаваны ў бягучым годзе праз паляпшэнне фінансавання бібліятэк, а не праз іх закрыццё.

Дадатковыя сервісныя (чытай – платныя) паслугі сталі адной з прыкмет часу ў бібліятэчнай справе. У пошуках дадатковых фінансавых уліванняў бібліятэкі распрацоўваюць доўгія спісы сваіх прэйскурантаў.

склала 13,9 тыс. чалавек. Магчыма таму кіраўніцтва бібліятэк і не спяшаецца адкрываць новыя ПЦПІ, тым больш што гэты працэс звязаны і з пэўнымі фінансавымі выдаткамі. Нагадаем, што ў адпаведнасці з Абласной праграмай развіцця публічных цэнтраў прававой інфармацыі і прававой асветы насельніцтва Віцебскай вобласці на 2010–2015 гг. на 2013 год было запланавана адкрыццё 12 ПЦПІ.

У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі» да канца 2015 года ўсе публічныя бібліятэкі сеткі Міністэрства культуры павінны быць камп'ютарызаваны і падключаны да глабальнай сеткі. На сённяшні дзень адзінай бібліятэчнай сістэмай са 100 %-ным узроўнем аўтаматызацыі з'яўляецца Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк. У сярэднім працэнт камп'ютарызацыі публічных бібліятэк за апошнія тры гады ўзрос з 44 % да 57 % (343 бібліятэкі).

Нагадаем, што вышэй азначанай праграмай прадугледжана абнаўленне камп'ютарнага парка на 20 % штогод, гэта значыць што за перыяд 2011–2015 гг. ён павінен быць абноўлены поўнасцю. За тры гады рэалізацыі праграмы камп'ютарны парк публічных бібліятэк Віцебскай вобласці не абноўлены нават на трэць (27,2 %). У 2013 годзе ў бібліятэкі паступіла 43 камп'ютары, што складае 5,5 % ад агульнага камп'ютарнага парка. Абсалютным лідарам па гэтым паказчыку стала Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк, якой за мінулы год было набыта 15 камп'ютараў.

Колькасць бібліятэк, якія прадастаўляюць доступ да інтэрнета, узрасло за год з 36 % да 40,6 % (243 бібліятэкі). Найлепшыя вынікі па падключэнні да сусветнай сеткі дасягнуты ў Дубровенскім (63,6 % бібліятэк), Лепельскім (60,8 %), Полацкім (59,5 %) і Чашніцкім (58,3 %) раёнах. Здзіўляе, што не ва ўсіх бібліятэках, падключаных да інтэрнэта маецца электронная пошта (ёсць у 226 бібліятэках). Цяжка ўявіць, што недзе яна можа быць незапатрабавана.

Дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі» таксама прадугледжана абнаўленне і мадэрнізацыя сервернага абсталявання бібліятэк. Ёсць пэўныя зрухі і ў рашэнні гэтага пытання: калі ў 2011 годзе не было набыта ніводнага



работа па фарміраванні рэспубліканскай БД «Беларусь у асобах і падзеях».

16 красавіка прайшла прэзентацыя кнігі «Пасля свята» віцебскага паэта і перакладчыка У.А. Папковіча.

6 мая адбылася прэзентацыя біябібліяграфічнага паказальніка «Герои 1812-го: ратные подвиги на Витебщине», падрыхтаванага супрацоўнікамі аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі.

У час візіту на Віцебшчыну дэлегацыі пісьменнікаў на чале са старшынёй ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» М. Чаргінцом у г.п. Бягомль Докшыцкага раёна была арганізавана разгорнутая кніжная выстава «Вітаю цябе, беларуская кніга!» і праведзены бібліяграфічны агляд «Па старонках літаратурных часопісаў Беларусі».

10 красавіка ў бібліятэцы прайшла сустрэча з прадстаўнікамі РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», на якой адбылася прэзентацыя кнігі галоўнага рэдактара беларускага дзіцячага часопіса «Вясёлка» У. Ліпскага «Сонца над галавой».

У выставачнай дзейнасці бібліятэкі значная ўвага надзялялася памятным датам Вялікай Айчыннай вайны. У агульнай чытальнай зале адбылася тэматычная выстава-прагляд: «В дни великих битв. 70 лет Курской и Сталинградской битвам».

Фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, патрыятычных адносін да Радзімы, павагі да яе гісторыі, культуры, традыцый, прапагандзе дасягненняў краіны ў галіне навукі, культуры быў прысвечаны цыкл выстаў «Беларусь незалежная»: «Беларускія імёны ў сусветнай навуцы і тэхніцы», «Канстытуцыя, улада і народ», «Глыбокія традыцыі сваяцтва і сяброўства: Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі», «Адкуль ёсць пайшла славянская пісьменнасць», «Моладзь у грамадска-палітычным жыцці Беларусі», «Беларусь незалежная» і інш.

На працягу справаздачнага года ў аддзеле абанемента чытачам прапаноўвалася літаратура на пастаянна афармленых тэматычных стэлажах: «Непаўторная Беларусь», «Гісторыя Беларусі», «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Да 95-годдзя з дня нараджэння дзяржаўнага і партыйнага дзеяча Беларусі, Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы П.М. Машэрава была падрыхтавана і арганізавана выязная кніжная выстава ў Дзяржаўным абласным аб'яднанні па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі.

13 лютага супрацоўнікі аддзела краязнаўства падрыхтавалі і правялі вечар памяці «С чувством личной причастности» да 24-й гадавіны вываду савецкіх войск з Афганістана. На мерапрыемстве прысутнічалі ўдзельнікі баявых дзеянняў у Рэспубліцы Афганістан, іх жонкі і матулі, удовы загінуўшых, жаночы савет афганскага таварыства «Братство», дэсантнікі 103-й асобнай гвардзейскай мабільнай брыгады, супрацоўнікі музеяў, педагогі, бібліятэкары, прадстаўнікі СМІ, студэнты і школьнікі.

19 снежня была праведзена прэзентацыя кнігі ветэрана Вялікай Айчыннай вайны ўрача Б.Л. Гінзбурга «Листки моего календаря». Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі ўдзельнікаў сустрэчы з ваеннымі ўспамінамі і вершамі аўтара.

У справаздачным годзе намаганнямі спецыялістаў бібліятэкі падрыхтаваны электронны рэсурс «Афганістан. Без права на забыццё», які створаны да 25-годдзя вываду савецкіх войск з Афганістана і прысвечаны воінам-інтэрнацыяналістам Віцебшчыны. Рэсурс уяўляе сабой камбінаваную базу даных і з'яўляецца вынікам рэалізацыі сумеснага праекта ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна», Віцебскай абласной арганізацыі ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане», Віцебскага гарадскога музея воінаў-інтэрнацыяналістаў. Пры падрыхтоўцы базы даных выкарыстаны поўнатэкставыя матэрыялы, фотадакументы з фондаў удзельнікаў праекта, а таксама асабістых архіваў воінаў-афганцаў.

Бібліятэка працягвала работу па папулярызацыі творчасці віцебскіх мастакоў. У 2013 годзе было арганізавана 6 мастацкіх выстаў. Гэта выстава фатаграфіі члена Саюза дызайнераў Беларусі Ігара Барсукова, персанальная выстава члена Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра



дадзенай катэгорыі карыстальнікаў пэўныя змяненні ў мінулым годзе ўсёж-такі адбыліся. У ходзе рэарганізацыі бібліятэчных сетак г. Полацка і Полацкага раёна спецыялізаваная бібліятэка-філіял № 9 для інвалідаў па зроку была пераўтворана ў публічную бібліятэку Полацкай раённай сеткі з выдзяленнем у яе структуры спецыялізаванага аддзела з фондам агучанай літаратуры, на прадпрыемстве ПУП «Элект» быў адкрыты пункт выдачы літаратуры для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

У 2013 годзе працягвала работу спецыялізаваная бібліятэка-філіял № 12 Аршанскай сеткі публічных бібліятэк. Ад сектара нестацыянарнага абслугоўвання Віцебскай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага функцыяніравалі 3 спецыялізаваныя бібліятэчныя пункты: 2 з іх – пры прадпрыемстве ПУП «Элект», а трэці, адкрыты ў першым квартале мінулага года, пры Віцебскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў.

У Аршанскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя А.С. Пушкіна ў 2013 годзе быў створаны спецыялізаваны аддзел па абслугоўванні інвалідаў па зроку. У снежні для яго было набыта абсталяванне вытворчасці Расійскай Федэрацыі: 2 электронных ручных відэапавелічыцеля «Видео Оптик», 2 тэлевізійных дысплэя, 2 магнітолы Sony, навушнікі.

Фарміраванне ў краіне адзінай інфармацыйна-прававой прасторы вызначана як адна з важнейшых агульнанацыянальных задач. Сістэма інфармацыйна-прававога забеспячэння грамадзян пастаянна пашыраецца і ўдасканальваецца, а ў выніку прававая інфармацыя становіцца ўсё больш даступнай. Гэта адбіваецца і на рабоце публічных цэнтраў прававой інфармацыі, што функцыяніруюць пры бібліятэках: калі раней бібліятэкі былі адным з нешматлікіх месцаў, што забяспечваюць доступ да актуальный прававой інфармацыі шырокаму колу грамадзян, то зараз яе можна легка атрымаць і не звяртаючыся ў бібліятэку. І лічбы статыстыкі гэта толькі падцвярджаюць: пры тым, што ў мінулым годзе пры бібліятэках было адкрыта 7 новых ПЦПІ (у Бешанковіцкай, Лепельскай і Сенненскай ЦБС – па 2, у Віцебскай РЦБС – 1, усяго па вобласці на 01.01.2014 – 89), колькасць кальстальнікаў знізілася амаль на 2 тысячы і

Найбольшыя тэмпы абнаўлення вызначаны ў Лепельскай (8,7 %) і Докшыцкай (7,4 %) сетках.

Нягледзячы на выкананне кантрольных паказчыкаў, сукупны фонд публічных бібліятэк сеткі Міністэрства культуры ў Віцебскай вобласці скарачаецца, бо тэмпы паступлення дакументаў у бібліятэкі ніжэйшыя за тэмпы выбыцця. У выніку гэтых працэсаў фонд за 2013 год зменшыўся амаль на 150 тысяч адзінак і склаў на пачатак бягучага года 7696332 экзэмпляраў.

Акрамя колькаснай характарыстыкі фонду турбуе і яго якаснае напаўненне. Некаторыя сістэмы сустракаюцца з цяжкасцямі пры афармленні падпіскі на перыядычныя выданні, у першую чаргу расійскую.

Набыццё сацыяльна значнай літаратуры вызначана прыярытэтным накірункам пры камплектаванні фондаў. За мінулы год публічныя бібліятэкі Віцебскай вобласці набылі яе ў колькасці 19,2 тыс. экзэмпляраў (амаль у два разы менш, чым у 2012 годзе) на суму 723,2 млн. рублёў. Тут лідарства трывала замацавалася за Браслаўскім (2,5 тыс. экз.) і Аршанскім (2,3 тыс. экз.) раёнамі.

На сучасным этапе назіраецца працэс павелічэння ў структуры паступленняў набытых электронных рэсурсаў, але ж дадзены паказчык паранейшаму мізэрны: па выніках 2013 года дакументы на электронных носьбітах у статыстыцы паступленняў склалі менш за 0,3 %. Набыццё сеткавых рэсурсаў большасцю публічных бібліятэк навогул не практыкуецца.

2013 год не прадэманстраваў істотных зрухаў і ў папаўненні фондаў агучанай літаратурай: на працягу мінулага года фонды публічных бібліятэк папоўніліся дакументамі такога тыпу толькі на 975 адзінак захоўвання (агульны фонд агучанай літаратуры на 01.01.2014 г. – 10,7 тыс.), і гэта пры тым, што і ў мінулым годзе публічныя бібліятэкі сеткі Міністэрства культуры ў Віцебскай вобласці працягвалі абслугоўванне інвалідаў па зроку.

Працягваючы тэму работы бібліятэк з невідушчымі і людзьмі з аслабленым зрокам, трэба адзначыць, што ў арганізацыі абслугоўвання



Вальнова «Прысвячэнне маці». 16 мая была адкрыта выстава работ віцебскіх мастакоў В. Ральцэвіча, Б. Лалыка, У. Вальнова, Л. Мядзвецкага, А. Ізаітка, А. Яснавай. Адбыліся персанальныя выставы жывапісу Н. Сарокінай «Любыя сэрцу прасторы», І. Магучай (пастэль, гуаш), члена Саюза мастакоў Беларусі А. Пшонкі «Разважанне на тэму...».

У справаздачным годзе ў бібліятэцы прайшла творчая сустрэча з паэтам, аўтарам-выканаўцам М. Кукулевічам, які выступіў з музычнай праграмай «Пушкінскі круг». Аўтар сямі паэтычных зборнікаў і дзвюх кніг прозы, дзесяці аўдыядыскаў з песнямі на свае вершы і вершы рускіх паэтаў выступіў з расповедам пра сваю творчасць, пра творчасць «паэтаў пушкінскай пары».

11 снежня адбылася прэзентацыя кнігі доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара Ігара Аляксандравіча Малевіча «Казімір Малевіч. Узыходжанне на крыж лёсу».

Аддзелам літаратуры па мастацтве было арганізавана звыш 45 тэматычных кніжных выстаў па жывапісе і скульптуры, музыцы і тэатры.

Для выкладчыкаў ВДУ імя П.М. Машэрава (педагагічны факультэт, кафедра музыкі) падрыхтаваны і праведзены Дзень спецыяліста: «У дапамогу музычнай адукацыі дзяцей».

На працягу справаздачнага года выкладчыкі ВДУ імя П.М. Машэрава, Дзяржаўнага музычнага каледжа імя І.І. Салярцінскага інфармаваліся аб новых паступленнях літаратуры па мастацтве. Для дадзенай катэгорыі карыстальнікаў былі падрыхтаваны інфармацыйныя спісы «Інфармацыйныя рэсурсы артсферы».

У справаздачным годзе працягвалася работа па фарміраванні кантэнту для мультымоўнай камбінаванай базы даных «Мастакі Віцебшчыны». Вядзенне БД «Мастакі Віцебшчыны» ажыццяўлялася ў трох версіях (на рускай, беларускай, англійскай мовах).

Прапагандзе здаровага ладу жыцця і прафілактыцы распаўсюджаных залежнасцяў быў прысвечаны шэраг тэматычных выстаў

у аддзелах абслугоўвання і цыкл віртуальных выстаў на сайце бібліятэкі.

12 лістапада ў аддзеле перыядычнай літаратуры адбылася сустрэча з намеснікам дэкана па вучэбнай рабоце механіка-тэхналагічнага факультэта УА «ВДТУ», кандыдатам тэхнічных навук, дацэнтам В.М. Патоцкім і членам рэдакцыйнага савета навукова-метадычнага часопіса «Здаровы лад жыцця» А.А. Шчыгельскім, у час якой была прадстаўлена прэзентацыя публікацый вучоных па пытаннях здаровага харчавання, злоўжывання лекавымі прэпаратамі і радыяфобіі.

18 студзеня 2013 года для калегіі Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя была падрыхтавана разгорнутая выстава-прагляд «Экалогія. Прырода. Жыццё».

2 красавіка была праведзена прэзентацыя выдання «Драпежныя птушкі Беларускага Паазер'я» кандыдата біялагічных навук, дацэнта кафедры экалогіі і аховы прыроды біялагічнага факультэта УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава» У.В. Іваноўскага.

У справаздачным годзе супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі і выдалі 2 бібліяграфічныя спісы экалагічнай тэматыкі: «Живая планета – живая душа: экологическое воспитание», «Экалагічная бяспека Рэспублікі Беларусь: прававое рэгуляванне», буклет «Экологический туризм в Республике Беларусь».

5 сакавіка ў Віцебскім абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя для ўдзельнікаў абласной калегіі супрацоўнікамі аддзела перыядычнай літаратуры быў праведзены агляд літаратуры «Інфармацыйныя рэсурсы Віцебскай абласной бібліятэкі па экалогіі», у якім былі прадстаўлены беларускія і расійскія перыядычныя выданні, што асвятляюць экалагічныя пытанні.

30 студзеня супрацоўнікі бібліятэкі прынялі ўдзел у рабоце метадычнага аб'яднання педагогаў-псіхолагаў дашкольных устаноў Першамайскага раёна г. Віцебска «Псіхолага-педагагічныя аспекты выхаваўчага патэнцыялу сучаснай сям'і». У рамках мерапрыемства былі праведзены прэзентацыя і агляд навукова-метадычных перыядычных



колькасці чытачоў быў выкананы на 101 %, па дакументавыдачы – на 105 %, па наведваннях – на 102,7%.

Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і падлеткаў забяспечваюць 39 дзіцячых бібліятэк (у 2012 годзе – 40), а пры адсутнасці магчымасці звярнуцца ў іх, дзіцячага чытага абслугоўваюць іншыя публічныя бібліятэкі сеткі Міністэрства культуры. У 2013 годзе ў выніку аптымізацыі сеткі ўстаноў культуры дзіцячая бібліятэка № 9 г. Оршы ўвайшла ў склад гарадской бібліятэкі імя У. Корбана Аршанскай раённай сеткі публічных бібліятэк як дзіцячае аддзяленне з поўным захаваннем штатнага складу і кніжнага фонду.

Адметна, што калі агульная колькасць карыстальнікаў дзіцячых бібліятэк вобласці зменшылася (110,2 тыс., – 2,5 тыс. да 2012 года), то па колькасці чытачоў-дзяцей да 15 год ёсць пэўная прыбаўка (93,6 тыс., +1 тыс. да 2012 года). Складваецца ўраджанне, што менавіта кіраўнікі дзіцячага чытання першымі пакідаюць бібліятэкі. На жаль, зніжэнне колькасці дакументавыдач у дзіцячых бібліятэках назіраецца па ўсіх катэгорыях карыстальнікаў (2084,2 тыс., – 71,2 тыс. да 2012 года), і гэта пры тым, што агульны фонд дзіцячых бібліятэк усеж-такі павялічыўся (1175,3 тыс., +36,2 тыс. да 2012 года).

Агульнавядома, што галоўнай умовай паспяховай дзейнасці бібліятэк з'яўляецца якасна ўкамплектаваны фонд. Пільная ўвага праблеме камплектавання ўдзяляецца і на дзяржаўным узроўні: кантроль за выкананнем Даручэння Прэзідэнта аб гарантаваным фінансаванні на камплектаванне ў памеры не менш за 15 % сродкаў ад сумы бюджэтнага фінансавання на іх утрыманне. У мінулым годзе гэты норматыў публічнымі бібліятэкамі быў выкананы і склаў 15,5 %. Найвышэйшыя паказчыкі былі дасягнуты ў Міёрскім і Верхнядзвінскім раёнах (17,9 % і 17,1 % адпаведна).

Працэнт абнаўлення фонда, прадугледжаны Дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі» ў памеры не менш за 5 % штогодна, таксама быў дасягнуты публічнымі бібліятэкамі і склаў 5,1 %.

бібліятэчных пунктаў нават скарацілася да 190 (–6 да 2012 года).

У 2011 годзе ў адпаведнасці з даручэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь было прынята рашэнне па правядзенні эксперымента па аб’яднанні сельскіх публічных і школьных бібліятэк. У 2012 годзе эксперымент распачаўся і на базе дзвюх бібліятэк Браслаўскага раёна – Мяжанскай і Далёкаўскай. У справаздачным годзе была запланавана паэтапная інтэграцыя бібліятэк у 11 населеных пунктах 8 раёнаў вобласці, але ж трохі да планавых паказчыкаў не дацягнулі: па дзве аб’яднаныя бібліятэкі запрацавалі ў Докшыцкім, Міёрскім і Полацкім раёнах, па адной – у Дубровенскім, Лепельскім, Ушацкім і Шумілінскім. Прынамсі, усе інтэграваныя бібліятэкі засталіся ў сетцы Міністэрства культуры.

Наведвальнасць бібліятэк на сённяшні дзень лічыцца адным з найважнейшых паказчыкаў яе работы: нездарма Дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады прадугледжана павелічэнне колькасці наведванняў (у т. л. аддаленых) на 5 % за перыяд яе рэалізацыі. Аднак мінулы год не паказаў прыметнага росту колькасці наведванняў публічных бібліятэк: у параўнанні з 2012 годам іх колькасць амаль не змянілася і склала 3832262 (+182). Але ж нагадаем, што ў дзяржаўнай статыстыцы не ўлічваліся віртуальныя карыстальнікі і наведванні.

Што тычыцца астатніх асноўных паказчыкаў работы, то па іх назіраецца трывалая тэндэнцыя да зніжэння: колькасць карыстальнікаў на канец года склала 519997 (– 1594 да 2012 года), дакументавыдач – 10096177 (–52995 да 2012 года). Толькі Віцебская, Лёзненская, Расонская і Талачынская раённыя сеткі далі прыбаўку і па адным, і па другім паказчыках, і гэты пры тым, што на Лёзненшчыне і Расоншчыне бібліятэчныя сеткі зменшыліся на 1 бібліятэку, а ў Віцебскім раёне было закрыта аж 4 бібліятэкі. Трэба адзначыць, што нягледзячы на зніжэнне ўсіх асноўных паказчыкаў работы адносныя застаюцца прыкладна на адным узроўні ўжо некалькі гадоў запар: чытальнасць – 19,4, абарачальнасць – 1,3; наведвальнасць – 7,4. Нельга абмінуць увагай і тое, што асноўныя планавыя паказчыкі ў вобласці былі дасягнуты: план па



выданняў па педагогіцы і псіхалогіі, прадстаўлены анатаваны бібліяграфічны спіс «Работа з сям'ёй ва ўмовах дашкольнай установы» і буклет «Дашкольная псіхалогія: інтэрнэт-рэсурсы».

У справаздачным годзе працягвалася супрацоўніцтва з ДУ «Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі». 22 сакавіка 2013 года для сацыяльных педагогаў была прадстаўлена выстава-агляд на тэму «Навука сямейнага шчасця», 25 верасня для выхавальнікаў груп падоўжанага дня праведзена выстава-агляд «Гульнёвыя формы выхаваўчай работы са школьнікамі».

14 кастрычніка на святочным вечары «Я гімны маці спяваю», прысвечаным Дню маці, ва УА «Віцебскі дзяржаўны політэхнічны каледж» для куратараў і выхавальнікаў адбыўся агляд-прэзентацыя «Выхаваўчая дзейнасць педагога», а таксама прадстаўлена выстава «Новая жаночая проза».

У аддзеле перыядычнай літаратуры ў верасні арганізаваны 3 рабочыя месцы для інвалідаў па зроку: устаноўлена тыфлаабсталяванне, якое дазваляе працаваць з плоскадрукаванымі тэкстамі, самастойна ствараць на камп'ютары дакументы, выкарыстоўваць сучасныя праграмныя сродкі для работы з інфармацыяй, дае магчымасць чытачам са слабым зрокам без пабочнай дапамогі карыстацца камп'ютарам. Электронны ручны відэапавелічальнік «ЭРВП КРУСТ-02» прызначаны для чытання друкаванага тэксту. Устаноўленае абсталяванне дазваляе чытачам са слабым зрокам і невідушчым атрымліваць неабмежаваны доступ да інфармацыйных рэсурсаў. У лістападзе адбылася экскурсія для членаў БелТІЗ з мэтай азнаямлення з новым тыфлаабсталяваннем. 2 снежня прайшла сустрэча з кіраўніцтвам віцебскага аддзялення БелТІЗ, на якой абмяркоўваліся планы сумесных мерапрыемстваў на 2014 год.

16 снежня аддзел перыядычнай літаратуры наведалі супрацоўнікі і пацыенты аддзялення рэабілітацыі інвалідаў па зроку Віцебскага абласнога тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання ветэранаў і інвалідаў. Яны азнаёміліся з магчымасцямі тыфлаабсталявання, яго

работай, інфармацыйнымі рэсурсамі.

9 кастрычніка ў бібліятэцы была адкрыта фотавыстава дабрачыннага праекта «Беларусь без сірот», прысвечаная выхаванцам ДУА «Дзіцячы дом г. Віцебска». Мэта праекта – знайсці дзецям-сіротам і дзецям, якія засталіся без папячыцельства бацькоў, новыя сем'і.

Абслугоўванне чытачоў старэйшага ўзросту і інвалідаў бібліятэкары працягвалі ажыццяўляць у рамках распрацаванай праграмы «Міласэрнасць і кніга», якая разлічана на сацыяльную адаптацыю слаба абароненых слаёў насельніцтва, у тым ліку дзяцей. Праграмай прадугледжаны працяг супрацоўніцтва з шэрагам гарадскіх устаноў і арганізацый: Віцебскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцай, спецыялізаванай школай № 26 г. Віцебска, інтэграванай групай дзіцячага сада № 6, Віцебскім домам-інтэрнатам для састарэлых і інвалідаў, Вялікалетчанскім дзіцячым домам, гарадскім хоспісам і інш.

2 мая ў рамках рэалізацыі бібліятэчнай праграмы «Міласэрнасць і кніга» супрацоўнікамі абласной бібліятэкі пры ўдзеле УКТП «Віцебскае трамвайна-тралейбуснае ўпраўленне» і філіяла «Аўтобусны парк № 1 г. Віцебска» ААТ «Віцебскаблаўтатранс» для выхаванцаў Вялікалетчанскага дзіцячага дома было арганізавана краязнаўчае падарожжа «Маленькі трамвай вялікага горада».

Асаблівая ўвага ўдзялялася абслугоўванню чытачоў старэйшага ўзросту і інвалідаў на абанеменце. Для дадзенай катэгорыі супрацоўнікі аддзела падбіралі літаратуру па папярэдніх спісах, прымалі заказы па тэлефоне, ажыццяўлялі абслугоўванне інвалідаў праз сацыяльных работнікаў, членаў іх сям'і. Ветэранам вайны выдавалі літаратуру «камерцыйнага абанемента» бясплатна.

На працягу года ў бібліятэцы праходзіла дабрачынная акцыя «Хоспіс: чужы боль, як свой» сярод чытачоў і супрацоўнікаў бібліятэкі па зборы кніг для бібліятэкі гарадскога хоспіса. 11 верасня адбыўся завяршальны этап дадзенай акцыі: больш за 500 кніг сабрана і перададзена ў анкалагічнае аддзяленне паліятыўнай медыцынскай дапамогі.



## *ПУБЛІЧНЫЯ БІБЛІЯТЭКІ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ: ПАД ЗНАКАМ АПТЫМІЗАЦЫІ*

*Оптимизация – выбор наилучшего варианта*
*из множества возможных...*
*(Лопатников Л.И. Экономико-математический словарь)*

На сённяшні дзень змены ў бібліятэчнай справе краіны ідуць пад лозунгам аптымізацыі. А па той прычыне, што яе вынікі (сацыяльны і эканамічны эфект) як правіла бываюць расцягнуты ў часе, то вызначаць змены, якія адбыліся ў мінулым годзе і адбываюцца зараз у бібліятэчным жыцці Віцебскага рэгіёна як аптымізацыю на дадзены момант можа і занадта смела. Па гэтай прычыне лічым справядлівым падаць статыстычныя звесткі аб зменах у бібліятэчнай сетцы вобласці без ацэнкі, бо на сённяшні дзень не валодаем доказамі «найлепшы варыянт быў выбраны ці не».

Публічныя бібліятэкі сеткі Міністэрства па-ранейшаму застаюцца самымі шматлікімі, нягледзячы на тое, што працэс іх скарачэння, які назіраецца на працягу многіх год, не перапыняецца і зараз. Зразумела, што гэтыя змены напрамую звязаны сацыяльна-дэмаграфічнымі працэсамі: скарачаецца сельскае насельніцтва – закрываюцца сельскія бібліятэкі. Галоўнае тут, здаецца, каб пэўныя прапорцыі ўсёж-такі захоўваліся. За мінулы год бібліятэчная сетка скарацілася на 22 адзінкі: з іх 16 бібліятэк было закрыта, 4 рэарганізаваны ў клубы-бібліятэкі і дзве былі аб'яднаны з іншымі. Такім чынам на пачатак бягучага года ў вобласці функцыяніравала 599 публічных бібліятэк (у тым ліку 40 бібліятэк-клубаў і 10 бібліятэк-музеяў), аб'яднаных у 23 ЦБС (даведачна: у 2013 годзе Аршанская і Полацкая гарадскія сеткі бібліятэк былі дапасаваны да адпаведных раённых сетак). З гэтай нагоды справядлівымі з'яўляюцца чаканні далейшага развіцця нестацыянарных формаў абслугоўвання – у першую чаргу бібліобусаў і бібліятэчных пунктаў. Але тут тэорыя і практыка бібліятэчнай справы разышліся: за справаздачны год у вобласці не было набыта ніводнага бібліобуса (па-ранейшаму 18 машын), а колькасць

бібліятэк у кантэксце агульначалавечых каштоўнасцей і беларускай дзяржаўнасці», падрыхтаванага Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

23–24 кастрычніка дэлегацыя ад бібліятэкі ўдзельнічала ў рабоце Міжнароднага кангрэса «Бібліятэка як феномен культуры», арганізаванага Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, у рамках якога быў прадстаўлены даклад «Інфармацыйныя рэсурсы ўласнай генерацыі ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна"».

На 15-х навуковых чытаннях у лістападзе, якія прайшлі ў рамках 25 Міжнароднага фестывалю імя І.І. Салярцінскага, супрацоўнікамі бібліятэкі быў прадстаўлены даклад-прэзентацыя біябібліяграфічнага паказальніка «Жыццё эпохі. Анатоль Багатыроў».

У мінулым годзе спецыялісты інфармацыйна-бібліяграфічнага аддзела і аддзела бібліятэказнаўства падрыхтавалі і правялі для супрацоўнікаў бібліятэкі Дзень спецыяліста «Бібліяграфічная майстэрня» і «Бібліятэкі замежжа: вынікі і перспектывы».

На працягу года карыстальнікам бібліятэкі аказваліся дадатковыя паслугі, якія былі зарыентаваны на камфортнасць карыстання інфармацыйнымі рэсурсамі бібліятэкі і задавальненне дадатковых запытаў карыстальнікаў. У справаздачным годзе бібліятэка выканала платных паслуг на суму 99,9 млн. рублёў.

*Адамян Т.М. – намеснік дырэктара*
*Віцебскай абласной бібліятэкі імя У.І. Леніна*



Актыўнымі ўдзельнікамі праведзенай акцыі сталі супрацоўнікі і чытачы Віцебскай абласной бібліятэкі. Для медперсаналу хоспіса бібліятэкарамі абанемента быў праведзены агляд спецыяльнай літаратуры «Кнігі, якія дапамагаюць жыць».

У мэтах прыцягнення пенсіянераў да актыўнага ўдзелу ў жыцці грамадства, далучэння пажылых людзей да сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у бібліятэцы працавала «Школа камп'ютарных ведаў». На працягу года супрацоўнікі электроннай чытальнай залы праводзілі бясплатныя трэнінгі і практычныя заняткі па вызначаных напрамках. Усяго за справаздачны перыяд у праекце прынялі ўдзел 72 чалавекі.

У 2013 годзе ў аддзеле ПЦПІ было зарэгістравана 3513 карыстальнікаў розных катэгорый. За 2013 год было выканана 4180 тэматычных запытаў, 4750 даведак прававой тэматыкі, а колькасць карыстальнікаў ЭБД «Эталон» склала 3210 чалавек. У фонд ПЦПІ паступіла 106 кніжных выданняў, аддзел атрымліваў 38 найменняў юрыдычных перыядычных выданняў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Да Дня работнікаў пракуратуры Публічны цэнтр прававой інфармацыі падрыхтаваў віртуальную выставу «З правам па жыцці», на якой былі прадстаўлены кнігі з аўтографамі і дароўнымі надпісамі, якія падараваў бібліятэцы навуковец, правазнаўца, кандыдат юрыдычных навук В.М. Галуза. З красавіка па ліпень справаздачнага перыяду ў аддзеле праводзілася сацыялагічнае даследаванне «ПЦПІ вачыма карыстальнікаў».

На працягу многіх год бібліятэка плённа супрацоўнічае з Інстытутам імя Гётэ ў Мінску. Дзякуючы супрацоўніцтву, вядучы бібліятэкар нямецкай чытальнай залы змог прыняць удзел у прафесійным візіце бібліятэкараў Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі ў Германію.

6–7 ліпеня супрацоўнік нямецкай чытальнай залы прыняў удзел у семінары па павышэнні кваліфікацыі інфармацыйна-бібліятэчных работнікаў «Будучыня бібліятэк», які арганізаваў Інстытут імя Гётэ ў Мінску. Рэферэнтам на семінары быў прэзідэнт Еўрапейскага Бюро

бібліятэчных, інфармацыйных і дакументацыйнага асацыяцый, дырэктар гарадской бібліятэкі г. Эсэна Клаус-Петэр Бетгер.

У рамках Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж абласнымі ўніверсальнымі навуковымі бібліятэкамі прыгранічных тэрыторый дзяржаў-удзельніц СНД ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» і ДБУК «Пскоўская абласная ўніверсальная навуковая бібліятэка» працягвалася цеснае супрацоўніцтва і развіццё партнёрскіх сувязей.

4 кастрычніка ў рамках правядзення IX Міжнароднай школы якасці ў бібліятэцы адбыўся круглы стол «Практика библиотек России и Беларуси в области качества информационно-библиотечного обслуживания», у рабоце якога прынялі ўдзел бібліятэчныя спецыялісты Расіі і Беларусі. Удзельнікі школы абмяняліся вопытам прафесійнай дзейнасці, разгледзелі пытанні менеджмента, развіцця і інфарматызацыі бібліятэк, азнаёміліся з практычным вопытам работы Віцебскай абласной бібліятэкі і цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя М. Горкага г. Віцебска.

22 студзеня ў абласной бібліятэцы ў рамках Дагавора аб супрацоўніцтве, які быў падпісаны паміж абласной бібліятэкай і міжнародным Інстытутам кіравання (г. Архангельск), адбылася творчая сустрэча «Кланяюсь в пояс дороге» з намеснікам старшыні Праўлення Маскоўскай гарадской арганізацыі Саюза пісьменнікаў Расіі, старшынёй Камісіі па ваенна-мастацкай літаратуры СП Расіі, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі РФ, заслужаным работнікам культуры РФ, кандыдатам педагагічных навук, паэтам У.А. Сілкіным.

У справаздачным годзе ў аддзеле дзіцячай літаратуры зарэгістравана 3757 чытачоў (2996 з іх – дзеці да 15 год), якім было выдана 95877 экзэмпляраў кніг і перыядычных выданняў. З мэтай прыцягнення ў бібліятэку новых чытачоў, папулярызацыі кнігі, чытання ў асяроддзі дзяцей і падлеткаў, а таксама раскрыцця кніжнага фонду аддзела, на працягу года вялася работа па арганізацыі кніжных выстаў і культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў. Аддзел дзіцячай літаратуры працягваў супрацоўнічаць з СШ № 12, 25, 40, 42, 46, гімназіямі № 1, 5, 8



Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

23 снежня адбылася рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Книжное наследие А.П. Сапунова», прысвечаная 130-годдзю выхаду ў свет першага тома выдання «Витебская старина» і 120-годдзю выхаду ў свет кнігі «Река Западная Двина». На канферэнцыі быў прадстаўлены даклад і прэзентацыя «Использование электронной коллекции “Витебщина: документальное наследие” в поиске малоизвестных исторических фактов, в выявлении и возвращении незаслуженно забытых имен в истории края».

На працягу года супрацоўнікі бібліятэкі прынялі ўдзел у міжнародных, рэспубліканскіх і абласных мерапрыемствах па павышэнні кваліфікацыі: круглым стале «Бібліятэкі Беларусі і фарміраванне інфармацыйнай культуры навучэнцаў і студэнтаў» (у рамках XX Мінскай Міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу, г. Мінск); канферэнцыі «Духоўнае адраджэнне грамадства і праваслаўная кніга» (у рамках XIX Міжнародных Кірыла-Мяфодзьеўскіх чытаннях, прысвечаных Дням славянскай пісьменнасці і культуры, г. Мінск).

16 красавіка 2013 г. супрацоўнікі аддзела «Электронная чытальная зала» прынялі ўдзел у on-line семінары-трэнінгу па выкарыстанні сістэмы інфармацыі «Passport», арганізаваным Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі сумесна з кампаніяй «Euromonitor International».

19 красавіка на V абласной навукова-практычнай канферэнцыі «Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і тэхналогіі Web 2.0 у бібліятэках» (г. Віцебск), арганізаванай Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкай і Віцебскай абласной навукова-тэхнічнай бібліятэкай, загадчык інфармацыйна-бібліяграфічнага аддзела выступіла з паведамленнем «Вопыт сеткавага карпаратыўнага ўзаемадзеяння Віцебскай абласной бібліятэкі імя. У.І. Леніна ў рамках рэспубліканскага кансорцыума па аналітычным роспісе дакументаў LibКАРД».

З 23 па 25 мая супрацоўнікі бібліятэкі прынялі ўдзел у рабоце III Форуму бібліятэкараў Беларусі «Гуманітарна-асветніцкая дзейнасць

«Бібліятэчная прастора. Віцебскі рэгіён», «Культурнае жыццё Віцебскай вобласці», «Палітра бібліятэчных мерапрыемстваў».

У сакавіку 2013 года для дырэктараў сетак публічных бібліятэк вобласці на базе Віцебскай абласной бібліятэкі быў праведзены абласны семінар «Статус і функцыі публічных бібліятэк у сучасных сацыякультурных умовах», у рамках якога прайшлі круглыя сталы «Бяспека ў бібліятэцы» і «Сацыяльнае партнёрства: вопыт, тэхналогіі, ацэнка». Да семінара была падрыхтавана выстава работ бібліятэк-удзельніц абласнога тура XXI рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры».

Супрацоўнікі аддзела бібліятэказнаўства ў якасці членаў журы прынялі ўдзел у падвядзенні вынікаў абласнога тура XXI рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры», абласных конкурсаў «Інавацыі ў рабоце бібліятэк» і на лепшы сайт сярод публічных бібліятэк.

19–20 чэрвеня 2013 года на базе Полацкай цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Ф. Скарыны была праведзена абласная навукова-практычная канфэрэнцыя «Праваслаўныя традыцыі ў духоўна-асветніцкай рабоце бібліятэк». Яе арганізатарамі выступілі супрацоўнікі аддзела бібліятэказнаўства Віцебскай абласной бібліятэкі, спецыялісты і кіраўнікі Полацкай сеткі публічных бібліятэк. Па яе выніках быў выдадзены зборнік, у які ўвайшлі даклады ўдзельнікаў канферэнцыі – супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, публічных бібліятэк вобласці, прадстаўнікоў Выдавецтва Беларускага Экзархата і Полацкай епархіі. Да канферэнцыі супрацоўнікамі аддзела бібліятэказнаўства быў падрыхтаваны даклад «Духоўна-асветніцкая работа публічных бібліятэк Віцебскай вобласці», які таксама ўвайшоў у зборнік.

У справаздачным годзе спецыялісты аддзела бібліятэказнаўства прынялі ўдзел у правядзенні рэспубліканскага сацыялагічнага даследавання «Эфектыўнасць функцыянавання аб'яднаных бібліятэк у сельскай мясцовасці», арганізатарам і каардынатарам якога выступіла



дзіцячымі садамі № 6, 97, 106, абласным аб'яднаннем па пазашкольнай рабоце, аказваў індывідуальную метадычную дапамогу супрацоўнікам іншых дзіцячых устаноў.

У рамках праграмы «Міласэрнасць» аддзелам наладжана сувязь з дапаможнай школай № 26, інтэграванай групай дзіцячага сада № 6 і інтэграваным класам СШ № 25. Супрацоўнікі аддзела праводзілі для іх масавыя мерапрыемствы, аказвалі метадычную дапамогу педагагічнаму калектыву ўстаноў.

З 18 па 22 сакавіка ў аддзеле дзіцячай літаратуры прайшоў Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі. Юным чытачам была прапанавана экскурсія «Кніжнае царства – мудрая дзяржава», выставы «Мілая справа – кніжка», «Кнігі-юбіляры 2013 года», «Капелі звонкія вершаў», «Жывая планета», літаратурны вечар «Вясёлыя рыфмы», гульні «Падарожжа ў краіну “Паэзія”» і «Markнакаляровая зямля Беларусі», а таксама конкурсы, гутаркі і віктарыны.

У справаздачным годзе па трох розных маршрутах прайшоў «бібліятэчны» трамвай. У першае краязнаўчае падарожжа пад назвай «Маленькі трамвай вялікага горада» ў пачатку мая адправіліся дзеці з Вялікалетчанскага дзіцячага дома. Наступны маршрут для чацвёртых класаў СШ № 25 быў экалагічным і называўся «Без квітка па белым свеце». Увосень па новым экскурсійным маршруце праехалі вучні трэціх класаў СШ № 46. Называлася гэтае падарожжа «Славутыя людзі ў старажытным горадзе».

У рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі ў аддзеле дзіцячай літаратуры быў рэалізаваны праект «Любімая кніга дзяцінства». На працягу тыдня праходзілі сустрэчы з людзьмі розных сфер дзейнасці, якія чыталі і расказвалі пра свае любімыя кнігі дзяцінства.

20 лютага ў сектары замежнай літаратуры адбылася краіназнаўчая гадзіна «Святы ў Вялікабрытаніі» для школьнікаў СШ № 29.

23 красавіка супрацоўнікамі нямецкай чытальнай залы была арганізавана «Велікодная майстэрня», у якой прынялі ўдзел школьнікі

СШ № 34 г. Віцебска. Бібліятэкары азнаёмілі вучняў з фондам нямецкай чытальнай залы, тэматычнай кніжнай выставай «Маляўнічы Вялікдзень», распавялі дзецям пра традыцыі святкавання Вялікадня ў Германіі. Навучэнцы сваімі рукамі зрабілі велікодныя сувеніры.

18 чэрвеня супрацоўнікі сектара замежнай літаратуры правялі з навучэнцамі школьнага лагера ДУА «Сярэдняя школа № 2» інфармацыйна-навучальную лекцыю-гульню «Слоўнікі – гэта сусвет у алфавітным парадку». Удзельнікі мерапрыемства азнаёміліся з разнастайнасцю слоўнікаў і прынялі ўдзел у гульні «Давайце слоўнікі адкрыем».

У чэрвені справаздачнага года вядучым бібліятэкарам нямецкай чытальнай залы была праведзена серыя мерапрыемстваў «Дарогамі Брэменскіх музыкантаў» на нямецкай мове для навучэнцаў лінгвістычнага лагера ДУА «Сярэдняя школа № 34 г. Віцебска».

26 чэрвеня ў аддзеле дзіцячай літаратуры адбылася сустрэча з Н.Р. Ільінай, дачкой пісьменніка-казачніка Р. Шакулава.

У кастрычніку сумесна з «Экалагічным патрулём» ВДУ імя П.М. Машэрава супрацоўнікі аддзела дзіцячай літаратуры правялі экалагічныя ўрокі «Загадкі роднай прыроды» для вучняў пачатковых класаў СШ № 46.

2013 год быў абвешчаны Годам беражлівасці. У сувязі з гэтым у аддзеле дзіцячай літаратуры прайшло некалькі выстаў, а таксама цыкл гутарак «Дзіўнае падарожжа па краіне Эканоміі», віктарына «Эканомія без таямніц» для дзяцей пачатковай школы СШ № 46 і СШ № 12.

У рамках рэалізацыі праекта «LeWiS» дырэктарам ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна» і дырэктарам СШ № 34 быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве і перадачы «Кніжнага чамаданчыка». Дагавор прадугледжвае аказанне метадычнай дапамогі ў вывучэнні нямецкай мовы і арганізацыі мерапрыемстваў, якія будуць праводзіцца як на базе абласной бібліятэкі, так і школы. Арганізацыя такога супрацоўніцтва стала магчымай дзякуючы партнёрскаму пагадненню паміж Віцебскай абласной бібліятэкай і інстытутам імя Гётэ ў Мінску, які курыруе работу нямецкай чытальнай



залы абласной бібліятэкі.

Аддзел перыядычнай літаратуры працаваў па праграме «Бібліятэка ў дапамогу педагогам». На працягу года супрацоўнікі аддзела ажыццяўлялі індывідуальнае інфармаванне настаўнікаў-прадметнікаў, педагогаў дашкольных устаноў. Супрацоўнікі аддзела праводзілі мерапрыемствы ва ўстановах адукацыі. 30 студзеня супрацоўнікі аддзела перыядычнай літаратуры прынялі ўдзел у рабоце метадычнага аб'яднання педагогаў-псіхолагаў дашкольных устаноў Першамайскага раёна г. Віцебска «Псіхолага-педагагічныя аспекты выхаваўчага патэнцыялу сучаснай сям'і». У рамках мерапрыемства былі праведзены прэзентацыя і агляд навукова-метадычных перыядычных выданняў па педагогіцы і псіхалогіі, прадстаўлены анатаваны бібліяграфічны спіс.

Супрацоўнікі аддзела перыядычнай літаратуры правялі гадзіну інфармацыі «Невычэрпная крыніца ідэй» для педагогаў устаноў адукацыі г. Віцебска. У ходзе мерапрыемства быў праведзены агляд навукова-метадычных выданняў па педагогіцы і псіхалогіі.

У справаздачным годзе ў рамках мастацка-эстэтычнага салона «ОЛИ-art», які дзейнічае пры аддзеле літаратуры па мастацтве, 4 лютага адбылася прэзентацыя кнігі старшыні салона У.І. Джарыяні «Наш выбар: з гісторыі тбіліскага клуба “Ракурс”».

18 ліпеня прайшла творчая вечарына паэта Д. Сімановіча, прымеркаваная да прэзентацыі яго новай кнігі «Чего там на жизнь обижаться».

Юбілейны творчы вечар «Тэатр па каханні» І.В. Баярынцава, рэжысёра, члена саюза тэатральных дзеячаў, выкладчыка каледжа культуры і мастацтваў адбыўся 6 чэрвеня.

14 лістапада прайшла юбілейная творчая сустрэча з артыстам, вядучым майстрам сцэны заслужанага калектыву «Беларускі тэатр “Лялька”» А. Маханьковым.

Аддзелам бібліятэказнаўства былі падрыхтаваны, выдадзены і распаўсюджаны наступныя метадычныя і інфармацыйныя выданні: